КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ

# [ ПРАЕКТ ]
# Дэкларацыя аб моладзевай палітыцы Дэмакратычных Сілаў Беларусі

[ Канферэнцыя Новая Беларусь 03-04 Жніўня 2024 ]

## Уступ

### *Мэта*

Гэты дакумент усталёўвае прыярытэты і падыходы да моладзевай палітыкі Дэмакратычных Сілаў Беларусі. Мэта прыняцця дакумента – азначэнне напрамкаў дзейнасці, імплементацыя якіх будзе садзейнічаць падтрымцы і пашырэнню правоў і магчымасцяў беларускай моладзі, забеспячэнню актыўнага ўдзелу моладзі ў дэмакратычным развіцці краіны і прасоўванне сярод моладзі еўрапейскіх каштоўнасцяў.

## Асноўныя прынцыпы моладзевай палітыкі Дэмакратычных сілаў Беларусі

### *Дэмакратычнае развіццё*

- *Правы чалавека і годнасць:* Гарантуе забеспячэнне поўнага ажыццяўлення маладымі людзьмі іх правоў.
- *Дэмакратычны ўдзел:* Заахвочванне актыўнага ўдзелу моладзі ў палітычных і грамадскіх працэсах.
- *Роўнасць:* Гарантыя забеспячэння роўных магчымасцяў для ўсіх групаў маладых людзей.
- *Гендарная роўнасць:* Забеспячэнне гендарнай роўнасці і прадухіленне гендарна абумоўленага парушэння правоў, дыскрымінацыі і гвалту.
- *Доступ да інфармацыі:* Садзейнічанне доступу моладзі да інфармацыі і кансультацыйных паслугаў дзеля рэалізацыі іх правоў, патэнцыялу і шырэйшага ўдзелу ў грамадска-палітычных працэсах.

### *Сумеснае жыццё ў разнастайных грамадствах*

- *Культурная разнастайнасць:* Пашырэнне магчымасцяў моладзі па захаванню ідэнтычнасці дзеля магчымасці прасоўвання культурнай разнастайнасці і ўдзелу ў міжкультурным дыялогу.
- *Антыдыскрымінацыя:* Садзеянне барацьбе з усімі формамі дыскрымінацыі.
- *Нацыянальная салідарнасць*: Прасоўванне нацыянальнай салідарнасці і магчымасцяў для супрацоўніцтва сярод беларускай моладзі і з іншымі групамі беларускага грамадства.

### *Сацыяльная інтэграцыя*

- *Падтрымка ўразлівай моладзі:* Пашырэнне магчымасцяў для моладзі з неблаганадзейных асяроддзяў.
- *Адукацыя і працаўладкаванне:* Забеспячэнне доступу да адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі і да рынкаў працы.
- *Пераход да рынку працы:* Падтрымка моладзі ў пераходзе ад адукацыі да рынку працы.

- *Культурны і спартыўны ўдзел:* Забеспячэнне роўнага доступу да культурных, спартыўных і творчых мерапрыемстваў.
- *Дыялог і прымірэнне паміж пакаленнямі:* Прасоўванне дыялогу і салідарнасці паміж пакаленнямі.

## Падыходы да рэалізацыі

### *Распрацоўка палітыкі і супрацоўніцтва*

- *Міжнароднае супрацоўніцтва:* Падтрымка рэалізацыі бягучых прынцыпаў праз міжнароднае супрацоўніцтва ў моладзевай палітыцы.
- *Сумеснае кіраванне:* Выкарыстанне сумеснага кіравання як механізма супрацоўніцтва паміж органамі прыняцця рашэнняў Дэмакратычных сілаў Беларусі і беларускімі моладзевымі арганізацыямі.

### *Моладзевая праца, адукацыя і падрыхтоўка*

- *Шматбаковае супрацоўніцтва:* Садзейнічанне міжнароднаму ўзаемаразуменню праз шматбаковае моладзевае супрацоўніцтва.
- *Міжкультурнае навучанне:* Выкарыстанне практык міжкультурнага навучання як метаду нефармальнай адукацыі для барацьбы з нецярпімасцю і дыскрымінацыяй.

### *Даследаванні і веды аб моладзі*

- *Даследаванні моладзі:* Прасоўванне палітыкі, заснаванай на фактах, праз даследаванні і супрацоўніцтва паміж моладдзю, даследчыкамі і палітыкамі.
- *Публікацыі і адукацыйныя матэрыялы:* Выпуск даследчых публікацый, адукацыйных і вучэбных матэрыялаў для падтрымкі моладзевай працы і палітыкі.

## Стратэгічныя прыярытэты

### *Прыярытэтныя напрамкі*

- *Ахова правоў чалавека і ўдзел у дэмакратычных працэсах:* З акцэнтам на правы, удзел і роўнасць.
- *Разнастайныя грамадствы:* Міжнародная і міжкультурная інтэграцыя, прадухіленне дыскрымінацыі і нацыянальная салідарнасць.
- *Сацыяльная інтэграцыя:* Падтрымка ўразлівых групаў моладзі, адукацыя, занятасць, незалежнасць, культурны ўдзел і дыялог паміж пакаленнямі.

## Каардынацыя і падтрымка

Адпаведныя органы Дэмакратычных Сілаў Беларусі павінны працаваць па наступных напрамках:

- *Распрацоўка праграм:* распрацаваць праграмы дзейнасці на аснове гэтага дакумента.

- ***Паляпшэнне каардынацыі:*** працаваць на ўзмацненне каардынацыі сярод ініцыятыў, звязаных з моладдзю.
- ***Інтэграцыя моладзевай перспектывы:*** улічваць моладзевую перспектыву ў сваіх праграмах і напрамках дзейнасці.
- ***Мабільнасць і валанцёрства:*** падтрымліваць і працаваць на пашырэнне праграмаў моладзевай мабільнасці, валанцёрскай дзейнасці і абменаў.
- ***Падтрымка моладзевых арганізацый:*** падтрымліваць беларускія моладзевыя арганізацыі ў іх дзейнасці па развіцці дэмакратычнага моладзевага сектара праз пашырэння доступу да рэсурсаў.